УДК 678.09

# МАКСІМ ФЁДАРАВІЧ БОЛБАС: ПАРТРЭТ НАВУКОЎЦА І ПЕДАГОГА

# MAXIM FEDOROVICH BOLBAS: THE PORTRAIT OF THE SCIENTIST AND THE EDUCATOR

**_М. В. Стралец_**
_доктар гістарычных навук, прафесар,_
_Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт,_
_Брэст, Рэспубліка Беларусь_

**_M. Streletz_**
_Doctor in History, Professor,_
_Brest State Technical University,_
_Brest, Republic of Belarus_

У артыкуле прасочваецца жыццёвы шлях доктара эканамічных навук, прафесара Максіма Фёдаравіча Болбаса. Ён складаецца з гераічных спраў у часы Вялікай Айчыннай вайны, паспяховага выкладанняў айчыннай сістэме адукацыі, узорнага выканання службовы хабавязкаў у Інстытуце эканомікі Акадэміі навук Беларускай ССР. Аўтар падводзіць чытача да высновы аб тым, што Максім Фёдаравіч ажыццявіў сістэмную рэканструкцыю гісторыі прамысловасці Беларусі ў дарэвалюцыйны перыяд.

The article traces the life path of Maxim Fedorovich Bolbas, Doctor of Economic Sciences, Professor. It consists of heroic deeds during the Great Patriotic War, a successful career in teaching within the national education system, honest performance of official duties at the Institute of Economics of the Byelorussian Academy of Sciences. The author brings the reader to the conclusion that Maxim Fedorovich carried out a systematic reconstruction of the history of Belarusian industry in the pre-revolutionary period.

_Ключавыя словы:_ Беларусь; Болбас Максім Фёдаравіч; гісторыя, навука; прамысловасць; эканоміка.

_Keywords:_ Belarus, Bolbas Maxim Fedorovich; history, science; industry; economy.

У гістарычнай навуцы яшчэ не здзейснівалася спроба комплекснага аналіза навукова-педагагічнай дзейнасці чалавека, якому цалкам прысвечана наша публікацыя. Гэта азначае, што гэтым артыкулам запаўняецца пэўная ніша.

1 ліпеня 2018 года спаўняецца 100 год з дня нараджэння доктара эканамічных навук, прафесара Максіма Фёдаравіча Болбаса. Яго карані трэба шукаць у вёсцы Слабодка Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці, у сялянскай сям'і.

Зусім маладым (Максіму Фёдаравічу было тады толькі 16 год) стаў сеяць разумнае, добрае, вечнае. Адлік яго педагагічнай дзейнасці стартаваў у Клічаўскім раёне Магілёўскай вобласці. Адразу адчувалася, што нараджэнец вёскі Слабодка – педагог ад бога. З цягам часу ён апынуўся у Камчацкай вобласці, дзе ў чарговы раз прадэманстраваў сваё педагагічнае майстэрства.

У гады Вялікай Айчыннай вайны педагог па прызванню займаецца зусім не мірнымі справамі. М. Ф. Болбас вырашае імкліва і адназначна: яго месца ў шэрагах удзельнікаў антыгерманскага супраціву. Спачатку была самаахвярная барацьба ў складзе Брожскага падполля. Гэтая барацьба будзе мець дакладна такі ж характар, калі падпольшчыка зменіць партызан. Максім Фёдаравіч трывала ўпісаў сваё імя ў баявыя справы атрада імя Кірава 37–й брыгады імя Пархоменкі, што дзейнічала на Міншчыне. Тут вельмі дарэчы звярнуцца да сведчанняў М. Храпко, Ф. Цапко, якія ваявалі побач з гэтым чалавекам. Змест гэтых сведчанняў такі: "Цяжка было знайсці ў атрадзе больш адважнага хлопца. Ён удзельнічаў у адзінаццаці баях па разгроме варожых гарнізонаў, хадзіў на "жалезку", падарваў чатыры аўтамашыны з салдатамі, двойчы быў паранены"[1].

Пасля вызвалення роднай зямлі пачаліся мірныя будні. Актыўны ўдзельнік партызанскага руху зноў паспяхова працуе ў сістэме адукацыі. Кіраўніцтва школамі ў былой Баранавіцкай вобласці спалучаецца з вучобай у Беларускім дзяржаўным універсітэце, які

ён скончыць у трыццацігадовым узросце. Гэта былі галодныя гады, звязаныя з вялікімі матэрыяльнымі нястачамі, За партамі сядзелі дзеці вайны, з якіх было нямала пераросткаў. Дырэктар змог у гэтых надзвычай складаных умовах на добрым узроўні арганізаваць працу педагагічных калектываў. Затым М. Ф. Болбас стаў вучыць будучых настаўнікаў. Яго прызначылі выкладчыкам Бабруйскага педагагічнага вучылішча. У працоўнай біяграфіі Максіма Фёдаравіча наступіў якасна новы этап, калі ён стаў працаваць у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Тут быў не толькі першы вопыт выкладання ў вышэйшай школе, але і першы вопыт навуковай дзейнасці. Быў зроблены выбар на ўсё астатняе жыццё: сістэмная рэканструкцыя гісторыі прамысловасці Беларусі ў дарэвалюцыйны перыяд. Нараджэнец вёскі Слабодка прадоўжыць адпаведныя навуковыя пошукі пасля пераезду ў сталіцу БССР.

Змест мінскага адрэзка працоўнай біяграфіі супадае з заняццем пасады старшага навуковага супрацоўніка Інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларусі. Менавіта ў гэтай навуковай установе Максім Фёдаравіч у 1962 годзе абараніў дысертацыю на тэму “Формы и стадии развития промышленности в дореформенной Белоруссии” на суісканне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук. У 1966 годзе ўбачыла свет манаграфія гэтага навукоўца “Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.)” [5]. Грунт дадзенай манаграфіі склала ўзгаданая дысертацыя. Ёсць сэнс сказаць пра тое, што новага ўнёс у навуку сваёй манаграфіяй старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларусі.

Быў капітальна даследаваны працэс перарастання рамяства ў дробную простую кааперацыю. М. Ф. Болбас пераканаўча даказаў, што напярэдадні рэформы 1861 года ў друкарскай, гарбарнай, ганчарнай, цагельнай, дрэва- і металаапрацоўчай, піваварнай, тытунёвай, мыла-свечачнай вытворчасці доля капіталістычных суб’ектаў гаспадарання была пераважнай. Аўтар выступіў піянерам у вылучэнні спецыфікі вотчынных мануфактур на беларускіх землях. Ён упершыню дакладна падлічыў, якая ж доля прамысловай прадукцыі выраблялася мануфактурнымі рабочымі ў апошні дарэформенны год. Да сённяшняга дня са спасылкай на М.Ф. Болбаса называюцца 48 працэнтаў. Навуковец адкрыў для чытача гісторыю першых фабрык у нашай Айчыне. Маюцца на ўвазе мукамольна-крупчастая фабрыка ў Магілёве, цукровая фабрыка ў Беліцы пад Гомелем. Праведзена вычарпальнае даследаванне кожнага з 30 прадпрыемстваў з машыннай вытворчасцю, якія існавалі ў дарэформенны час. Сапраўды ўзрушвае дэталёвы галіновы аналіз прамысловасці датычна гэтага часу. Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларусі паказаў, што тут з рэзкім адрывам ад астатніх галін лідзіравала харчасмакавая прамысловасць. Упершыню выяўлены чыннікі, якія прадвызначылі рэзкае ўзрастанне дынамікі датычна вытворчых паказчыкаў у галіне дрэваапрацоўчай і папяровай прамысловасці пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі. Прасочана ўзнікненне суднабудавання, запалкавых, фанерных прадпрыемстваў. Выхад манаграфіі М. Ф. Болбаса азначаў знікненне “белых плям”, звязанных з гісторыяй палатняных парусінавых мануфактур у Горках, Добрушы, Крычаве, Шклове, суконных мануфактур у Дуброўна, Нясвіжы, Хомску, шаўкаткацкай мануфактуры ў Шклове. Па-майстэрску паказаны генезіс жалезаробных мануфактур [5].

З 1968 г. пачалася больш чым дваццацігадовая праца М. Ф. Болбаса ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце (зараз дзяржаўным тэхнічным універсітэце). Ён пройдзе тут шлях ад старшага выкладчыка да прафесара, у 1979–1984 гг. будзе ўзначальваць кафедру палітычнай эканоміі, якую сам створыць. У 1978 годзе выйшла манаграфія Максіма Фёдаравіча пад назвай “Промышленность Белоруссии, 1860–1900 гг.” [4].

Разбор гэтай манаграфіі пачнём з таго, што яе аб’ядноўвае з вышэй узгаданай. Нязменнай заставалася марксісцка-ленінская метадалогія. Яна працягвае першую манаграфію ў праблемна-храналагічным плане. Паўсюдна адчуваецца почырк нястомнага працаўніка навукі. Ядро крынічнай базы складае эксклюзіўная фактура, якая была выяўлена за час шматгадовай працы ў архівах. Вось пералік адпаведных архіваў: Цэнтральны гістарычны архіў БССР, Цэнтральны гістарычны архіў Літоўскай ССР, Цэнтральны гістарычны архіў СССР. Да гэтага трэба дадаць велізарную колькасць статыстычных выданняў, большасць якіх знаходзілася ў аддзеле рэдкай кнігі бібліятэк Масквы, Ленінграда, Мінска. Дэманструючы высокую даследчыцкую культуру, аўтар вычарпальна паказаў унёсак сваіх калег у распрацоўваемую праблематыку.

Пры азнаямленні з манаграфіяй “Промышленность Белоруссии, 1860–1900 гг.” моцнае ўражанне робіць аповед аўтара пра яго творчую кухню. У прадмове чытаем: “Все источники были расписаны по 50 тыс. карточек (отдельных предприятий), а поуездные и погубернские данные сведены в 5 тыс. таблиц, сгруппированы по уездам и губерниям, областям и годам. Это позволило критически проанализировать их. На основе данных карточек определены коли-

чество предприятий, рабочих на каждом из них, мощность двигателей, объем производства, темпы роста (в каждой форме и области промышленности, а также по губерниям и уездам). При отсутствии сведений за те или иные годы брались данные за смежные годы и данные за год определялись как средние. При отсутствии сводных поуездных данных последние определялись по материалам карточек отдельных предприятий и другими методами расчета. Поэтому динамика части мелких неакцизных производств, и в первую очередь домашних и отхожих промыслов, по отдельным губерниям и областям дана на основе приближенных подсчетов. Более точными являются сводные данные о мануфактурного-фабричной промышленности, потому что они уточнялись достаточно подробными сведениями с карточки каждого предприятия" [4, с. 6]. Выразы "расписаны па 50 тыс. карточек", "сведены в 5 тыс. таблиц" сведчылі пра тое, што здзейснены сапраўдны навуковы подзвіг. А да гэтага трэба яшчэ дабавіць моцную аналітычную працу. М.Ф. Болбас шмат чаго зрабіў упершыню.

Перад намі абагульняючая карціна дынамікі форм і галін айчыннай прамысловасці ў парэформенны перыяд. Гэта дынаміка аднолькава вычарпальна даследуецца датычна ўсіх форм прамысловасці: хатняй, рамеснай, дробнай капіталістычнай, мануфактурнай, фабрычнай. Прыцягнуты нестандартныя метады для вызначэння ўзроўня прадукцыйнасці працы. Упершыню ў гісторыка-эканамічнай навуцы паказана, што "среднегодовая производительность 1 рабочего в Белоруссии, составив в 1862 г. только 162 р., к 1900 г. достигла 563 р." [4, с. 101]. У дакладных межах сучаснай тэрыторыі Беларусі высвятляецца ўвесь спектр пытанняў, звязаных з спецыялізацыяй і размяшчэннем суб'ектаў гаспадарання. У гэты ж шэраг трэба паставіць таксама разгляд прамысловага пераварота ў інтэр'еры агульнарасійскіх сацыяльна-эканамічных і тэхналагічных рэалій [4, с.74-87]. Пераканаўча даказана, што "промышленный переворот в Белоруссии был совершён до 1900 г. (приблизительно в 1898–1899 гг.), то есть лет на 10 позднее, чем по России в целом" [4, с. 86]. Прадметам спецыяльнага даследавання сталі прамысловыя крызісы 1873–1875, 1881–1882 гг. Грунтоўна прасочана ўзнікненне купецкіх фабрык. Фундаментальна прааналізавана роля нятытульных этнасаў і перш за ўсё габрэяў у развіцці айчыннай прамысловасці. Навуковец пераканаўча даказаў, што Беларусь не была адсталай ускраінай дарэвалюцыйнай Расіі ў галіне прамысловага развіцця.

Манаграфіі 1966 і 1978 гг. утварылі базіс дысертацыі М.Ф. Болбаса на тэму «Развитие промышленности в Белоруссии : 1795–1900 гг.» на суісканне вучонай ступені доктара эканамічных навук [6]. Гэта дысертацыя была абаронена ў Маскоўскім інстытуце народнай гаспадаркі імя Г.В. Пляханава ў 1984 годзе. Нараджэнец вёскі Слабодка стаў першым доктарам эканамічных навук у заходнім рэгіёне БССР. У дадзеным рэгіёне да 1985 года не было ніводнага ўладальніка вучонага звання прафесара па кафедры палітычнай эканоміі. І тут брэсцкі вучоны і педагог будзе першым.

Заўважым, што яшчэ да абароны доктарскай дысертацыі ў Максіма Фёдаравіча быў нямалы вопыт прапаганды тых ведаў, якія былі звязаны з яго навуковымі інтарэсамі. Аб гэтым сведчаць дзясяткі артыкулаў, якія ён аднаасобна напісаў для ўніверсальнай беларускай энцыклапедыі. Пасля абароны доктарскай дысертацыі вучоны і педагог працягваў даследчыцкую працу ў значна меншым аб'ёме, зрабіўшы акцэнт на папулярызацыю гісторыі прамысловасці Беларусі ў дарэвалюцыйны перыяд. Выйшлі дзве адпаведныя кнігі. Адна была напісана аднаасобна [3], другая – у сааўтарстве [2],

Заслугі гэтага чалавека перад Айчынай будуць адзначаны шэрагам узнагарод. Праз сорак год пасля Вялікай Перамогі М. Ф. Болбас папоўніць корпус кавалераў ордэна Айчыннай вайны 1-й ступені [1]. За высокія паказчыкі ў прафесійнай дзейнасці вучоны і педагог узнагароджваўся ганаровымі граматамі рэспубліканскага галіновага міністэрства, граматамі рэктарата Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута.

Ён быў чалавекам з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Будучы этнічным беларусам, навуковец і педагог пастаянна змагаўся супраць антысемітызма. Добра вядома, што ён заходзіў у Брэсцкі абласны камітэт Камуністычнай партыі Беларусі і прынцыпова ставіў пытанне аб неабходнасці спыніць распальванне антысемітызма ў грамадстве. Гэта быў учынак грамадзяніна, Чалавека з вялікай літары. Максім Фёдаравіч літаральна закідваў лістамі кіруючыя партыйныя і савецкія органы, у якіх прынцыпова выказваўся па надзённых пытаннях. Такія людзі былі рэдкімі ў савецкі час. Абсалютная ж большасць грамадзян упісвалася ў вобраз homo soveticus.

Гэты чалавек праявіў сябе як узорны сем'янін. Разам з жонкай, якая шмат гадоў працавала ў сістэме аховы здароўя, вырасціў дзьвюх дачок.

М. Ф. Болбас пайшоў з жыцця 1 красавіка 1997 года [1].

Па-за сумневу, яго багатае на падзеі жыццё з'яўляецца выдатным прkладам для сучаснай моладзі. Памяць пра партызана, навукоўца, педагога Максіма

Фёдаравіча Болбаса заўсёды будзе жыць ў сэрцах людзей, якія разам з ім працавалі.

## Спіс выкарыставаных крыніц


1. Болбас, Максім Фёдаравіч – Википедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/.../Болбас,_Максим_Фёдорович. – Дата доступа: 14.02.2018.
2. Болбас, М. Ф. Помнікі навукі і тэхнікі Беларусі / М. Ф. Болбас, А. Л. Кіштымаў. – Мінск : Полымя, 1990. – 12 с.
3. Болбас, М. Ф. Прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі / аўтар-складальнік М. Ф. Болбас. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1988. – 320 с.
4. Болбас, М. Ф. Промышленность Белоруссии, 1860–1900 гг. / М.Ф. Болбас. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. –312 с.
5. Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Минск : Наука и техника, 1966. – 268 с.
6. Болбас, М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии : 1795–1900 гг. : дисс. ... д-ра экон. наук : 08.00.03. – Брест, 1982. – 377 с.



***Дата подачи статьи: 29.08.2018***